Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 СТУДЗЕНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 2 (27612) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Ці ёсць у Гродне паркоўкі для інвалідаў?

СТАР.4

Наш народны каляндар

СТАР.6

Дыхай над парай эўкаліпта

СТАР.8

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАВЕДАЎ ХРАМ-ПОМНІК У ГОНАР УСІХ СВЯТЫХ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў свята Раства Хрыстовага наведаў Храм-помнік Усіх Святых у Мінску, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы разам з мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Паўлам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі запаліў калядную свечку ў прыдзеле ў гонар Іаана Хрысціцеля. З нагоды свята яны таксама абмяняліся падарункамі. Аляксандр Лукашэнка падарыў мітрапаліту сервіз з відарысамі Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.

У сваю чаргу прадстаяцель Беларускай праваслаўнай царквы падарыў Прэзідэнту факсімільную копію старажытнага Евангелля.

Выхаванцы нядзельнай школы Усіхсвяцкага прыхода віталі кіраўніка дзяржавы вершамі. Аляксандр Лукашэнка таксама паслухаў калядныя песнапенні ў выкананні мужчынскага хору гэтага прыхода.

Размова Аляксандра Лукашэнкі з мітрапалітам Паўлам прадоўжылася за чаяваннем.

Да наведвання храма Аляксандр Лукашэнка разам з малодшым сынам Мікалаем ускладлі кветкі да помніка Патрыярху Аляксію II.

Фота БЕЛТА.

ПЕРАМОГА — У МАЦНЕЙШАГА

Каманда Беларусі абыграла Расію ў фінале Х Каляднага хакейнага турніру

Каманда Беларусі па булітах абыграла дружыну Расіі на лёдзе «Мінск-Арэны» ў фінальным матчы Х Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Беларусь — Расія — 3:2 (2:1, 0:1, 0:0, 1:0).

Беларусь: Баскаў; Плотнікаў — Аляксееў; У. Цыплакоў — Бекбулатаў (к) — Міхалёў; Світа — С. Стась, Асташэвіч — А.Р. Лукашэнка — Белы, Радзінскі — Макрыцкі, Антоненка — Задзяленаў — Слыш; А. Мікульчык — Летаў, Савілаў — Малашкевіч — Лісічкін; Панамароў.

Расія: Міхайлаўскі (Малкаў); Ігнатаў — С. Сёмін, Падалінскі — Варыцкі — А. Мядзведзеў (к); Анціпін — М. Сёмін, Папярэчны — Хасанаў — Шамолін; Трашчынскі — Камалетдзінаў; Харытонаў — Гардзіюк — Мяркулаў; Субоцін, Жынкоў, Шаўцоў.

Шайбы: 1:0 — Савілаў (Лісічкін, Малашкевіч, 5 мінута), 2:0 — Антоненка (Міхалёў, 11, у большасці), 2:1 — Харытонаў (М. Ігнатаў, 19), 2:2 — Субоцін (Гардзіюк, 40), 3:2 — Панамароў (рашаючы буліт, 60).

Штраф: 2–10.

Героем паядынку стаў форвард беларускай каманды Сцяпан Панамароў, які выканаў рашаючы буліт.

Лепшымі гульцамі матча прызнаны Сяргей Задзяленаў і Сцяпан Панамароў у каманды Беларусі, а таксама Андрэй Малкаў і Уладзіслаў Папярэчны ў дружыны Расіі.

Апошнім (пятым) пераможцам акцыі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба «Шчаслівы балельшчык» і ўладальнікам двух абанементаў на матчы маючага адбыцца ў маі гэтага года чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску стаў пенсіянер Міхаіл Алес'еў, які працуе майстрам у СТАА «Арвіт-Аўто».

Бронзавым прызёрам Х Каляднага турніру стала каманда Фінляндыі. У паядынку за 3-е месца яна 7 студзеня выйграла ў каманды Славакіі з лікам 8:5 (3:2, 4:0, 1:3). Фінскія хакеісты сталі бронзавымі прызёрамі Каляднага хакейнага турніру 5-ы раз. Раней яны былі медалістамі ў 2007, 2009, 2010 і 2011 гадах.

У мінулыя гады пераможцамі Каляднага турніру сем разоў станавілася каманда Прэзідэнта Беларусі (у 2005, 2006, 2008, 2009, 2010, 2012 і 2013 гадах). Двойчы поспех святкавала расійская дружына, якая ў 2007 і 2011 гадах перамагла ў фінале беларусаў.

Арганізатарамі цяперашніх спаборніцтваў выступаюць Міністэрства спорту і турызму Беларусі, Мінскі гарвыканкам, ФХРБ і Прэзідэнцкі спартыўны клуб. Партнёры турніру — кампаніі «Вэлком», «Беларускалій» і Пріорбанк. Інфармацыйны партнёр — Белтэлерадыёкампанія.

Фота БЕЛТА.

СВЯТОЧНАЯ ЮШКА

На Каляды магілёўцы спаборнічалі ў падрыхтоўцы галоўнай рыбацкай стравы. Падчас народнага свята ў Пячэрскім лесапарку адбыўся традыцыйны конкурс «Добрая юшка наша!». Навагоднія персанажы, Дзед Мароз і Снягурка, далучыліся да свята.

ЦЫТАТА ДНЯ

Святлана САРОКА, галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя:

«У краіне штогод праводзіцца каля 2200—2400 працэдур экстракарпаральнага апладнення. Выніковасць такога метаду лячэння бясплоддзя летась склала каля 40%. Такім чынам, большасць пар вымушаны паўтараць працэдуру, якая патрабуе ад сям'і сур'ёзных матэрыяльных укладанняў. З 1 студзеня 2014 года ў іх з'явілася магчымасць узяць на гэтыя мэты льготны крэдыт: уступіў у сілу Указ Прэзідэнта «Аб прадастаўленні грамадзянам Рэспублікі Беларусь крэдытаў на льготных умовах для аплаты экстракарпаральнага апладнення». Магчымасць атрымання льготных крэдытаў на ЭКА павялічыць шанцы стаць бацькамі тым, хто даўно пра гэта марыць, і станоўча адаб'ецца на павелічэнні нараджальнасці ў Беларусі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.01.2014 г.

Долар ЗША	9530,00	▲
Еўра	12980,00	▼
Рас. руб.	288,50	▲
Укр. грыўня	1158,66	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+4°
Віцебск	+4°
Гомель	+4°
Гродна	+4°
Магілёў	+4°
Мінск	+3°

■ З нагоды

ЗАСТАЎСЯ ЖЫЦЬ, КАБ РАСКАЗАЦЬ ПРАЎДУ

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Алесь Савіцкі… Былы партызан-падрыўнік, баец Савецкай Арміі, чалавек, які дайшоў да Берліна і распісаўся на рэйхстагу. Тройчы паранены, ён неаднойчы глядзеў у вочы смерці. І ці думаў ён у тыя імгненні, што дажыве да Перамогі і стане вядомым пісьменнікам, ці мог уявіць, што адсвяткуе сваё 90-годдзе, ці спадзяваўся, што з юбілеем яго будзе віншаваць уся краіна?

Алесь Ануфрыевіч нарадзіўся ў Полацку, у сям'і кадравага афіцэра Чырвонай Арміі. Іх было чацвёра — адна дачка і тры сыны. Ён быў сярэднім.

Вайна Савіцкіх напаткала ў Гродне, дзе праходзіў службу бацька. Калі яны вярнуліся ў Полацк, у горадзе ўжо ўладарылі немцы. Пачалося жыццё на акупаванай тэрыторыі. У той час, калі некаторыя прыпісвалі сабе «хваробы», каб толькі не ісці на фронт, Алесь Савіцкі прыбавіў сабе год — і яго ўзялі ў партызанскі атрад «Смерць фашызму». Трапіўшы ў групу падрыўнікоў, разам з баявымі таварышамі падрываў чыгункі, масты, арганізоўваў на дарогах засады.

Вось што напісана ў «Баявой характарыстыцы Савіцкага»: «…За перыяд з лістапада 1942 па ліпень 1943 года ў партызанскім атрадзе «Смерць фашызму» таварыш Савіцкі мае на сваім баявым рахунку: пушчаных пад адхон варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай — чатыры эшалоны, падарваныя на процітанкавых мінах — тры варожыя аўтамашыны з жывой сілай; таварыш Савіцкі асабіста падарваў 5 шашэйных мастоў і 2 чыгуначныя масты на лініі Полацк — Маладзечна, ім было знішчана 27 нямецкіх салдат і афіцэраў».

Праўда, за гэтымі немалымі лічбамі хаваецца боль і горыч, якія выліліся ў тры сур'ёзныя раненні юнага змагара. Толькі Алесь Ануфрыевіч гаварыць пра гэта не любіць. У яго на гэты конт свой адказ: «На родную зямлю прыйшоў чужынец, прыйшоў захопнік. І трэба было выбіраць: альбо браць у рукі зброю, ведаючы, што за гэта будзе, альбо скарыцца і працаваць на акупанта. Мужнасць нараджалася з любові да роднага краю і жывілася мастацкім словам».

СТАР.2

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Савіцкага з 90-годдзем. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Як адзначыў Прэзідэнт, жыццё Алесь Савіцкага з'яўляецца яскравым прыкладам самаадданага служэння Радзіме. «Сёння Вас добра ведаюць і шануюць як выдатнага празаіка і публіцыста, кнігі якога перакладзены на розныя мовы свету. Вялікай павагі заслугоўвае Ваша актыўная грамадская работа па духоўным і патрыятычным выхаванні моладзі», — гаворыцца ў віншаванні.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МЕРКЕЛЬ АТРЫМАЛА ТРАЎМУ ПАДЧАС КАТАННЯ НА ЛЫЖАХ

Федэральны канцлер Германіі Ангела Меркель атрымала пералом костак таза, катаючыся на лыжах у Швейцарыі. Падкрэсліваецца, што Ангела Меркель каталася на бегавых, а не на горных лыжах. Для лячэння ад атрыманай траўмы канцлеру прыйдзецца прытрымлівацца пасцельнага рэжыму на працягу бліжэйшых трох тыдняў, што ўнясе карэктывы ў яе працоўны графік. Некалькі запланаваных паездак давядзецца адмяніць. Ангеле Меркель 59 гадоў, яна займае пасаду федэральнага канцлера Германіі з 21 лістапада 2005 года, з'яўляецца лідарам Хрысціянска-дэмакратычнага саюза Германіі.

У ПОЛЬШЧЫ БУДУЦЬ НАЗАЎЖДЫ АДБІРАЦЬ ПРАВЫ Ў П'ЯНЫХ КІРОЎЦАЎ, ВІНАВАТЫХ У СМЯРОТНЫХ АВАРЫЯХ

Пасля смяротнай аварыі з шасцю загінулымі, вінаватым якой аказаўся нецвярозы кіроўца, польскі ўрад падрыхтаваў і ўзгадніў пакет рэкамендацый, якія тычацца барацьбы з п'янствам за рулём. Адным з новаўвядзенняў будзе пажыццёвае пазбаўленне правоў для кіроўцаў, якія ў нецвярозым стане сталі вінаватымі ў смяротных здарэннях або аварыях, якія прывялі да цяжкога калецтва. Прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск заявіў, што істотна павялічацца і штрафы за кіраванне ў нецвярозым стане. Напрыклад, у першы раз такому кіроўцу прыйдзецца заплаціць пяць тысяч злотых (прыкладна 1600 долараў), а ў выпадку паўторнага інцыдэнту штраф складзе мінімум 10 тысяч злотых. Яшчэ адна мера ў барацьбе з п'янымі кіроўцамі — абсталяванне аўтамабіляў алкатэстарамі. Такія прылады павінны быць усталяваны ва ўсіх аўтамабілях да 2015 года.

УСЯГО АДЗІН МЕСЯЦ БЕЗ СПІРТНОГА МОЖА ІСТОТНА ЗМЯНІЦЬ СТАН АРГАНІЗМА

Спецыялісты высветлілі, як уплывае на арганізм адмова ад спіртнога працягласцю ў месяц. Аказваецца, «сухі месяц» дазваляе знізіць узровень халестэрыну, пахудзець, палепшыць рэжым сну і павысіць актыўнасць на працы. У цэлым жа печань атрымлівае магчымасць аднавіцца, перадае The Daily Mail. Як паказала даследаванне Каралеўскага шпіталя Лондана, у сярэднім адмова ад алкаголю на пяць тыдняў дазваляла скінуць 1,5 кілаграма, знізіць узровень халестэрыну на 5%, узровень тлушчу ў печані — на 15%, а паказчыкі цукру — амаль на чвэрць. Трэба сказаць, гепатолагі звычайна ўстрымліваюцца ад каментарыяў адносна карысці адмовы ад спіртнога для людзей, якія п'юць ва ўмераным аб'ёме. Як правіла, яны факусіруюцца на праблемах алкаголікаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

УВАГА! МАГНІТНАЯ БУРА

Яе прычынай стала ўспышка (найвышэйшага класа магутнасці Х), якая адбылася на Сонцы. Паводле слоў навукоўцаў, зафіксаваная ўспышка з'яўляецца адной з самых буйных за апошнія некалькі гадоў. Яе крыніцай стала група плям 1944. Пры гэтым самая вялікая пляма перавышае памеры Зямлі ў два разы. У NASA паведамляюць, што падобная ўспышка здольная выклікаць моцную магнітную

буру на Зямлі — першую ў гэтым годзе. Паводле папярэдніх даных, яна можа пачацца ўжо сёння. Зараз навукоўцы назіраюць самую высокую сонечную актыўнасць за апошнюю тысячу гадоў. На Зямлі такія з'явы небяспечныя, напрыклад, для ліній электрапередачы, газаправодаў. Падчас магнітных бур медыкі таксама папярэджваюць аб магчымым пагаршэнні самаадчування і раяць людзям надаць пільную ўвагу свайму здароўю.

КОРАТКА

Амаль 129 тыс. чалавек прынялі ўдзел у калядных богаслужэннях у праваслаўных храмах Беларусі.

Беларусь атрымала $440 млн з расійскага крэдыту на $2 млрд.

Трэцяя батарэя зенітна-ракетнага комплексу «Тор-М2», выробленага ў Расіі, паступіла на ўзбраенне 120-й зенітнай ракетнай брыгады Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ВПС і войскаў ППА.

ДАІ Мінска плануе ў гэтым годзе правесці амаль 300 акцый, накіраваных на прафілактыку дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей.

Самы доўгі ў свеце каток пад адкрытым небам адкрыўся 3 студзеня ў канадскай сталіцы Атаве на канале Рыдо каля Парламенцкага ўзгорка. Даўжыня яго — 7,8 км, шырыня ў розных месцах — ад 20 да 70 м, агульная плошча катка складае 165,6 тыс.кв.м.

■ Здаровы святкуйце!

СЦЕЛЕ СЦЕЖКІ КАЛЯДА

Без снега і зіму — не зіма, і Новы год з Калядамі падаюцца не такімі казачнымі ды чароўнымі. Але ж якім ні было б надвор'е, святы ніхто не адмяняў. Каб атмасфера зімніх цудаў запанавала ў кожнай хаце, карэспандэнт «Звязды» ў складзе гурта калядоўшчыкаў выправілася несці людзям радасць у слаўным горадзе Лагойску.

ТЫЯ, КАГО ВЯДЗЕ ЗОРКА

Сярод нас амаль немагчыма сустрэць прафесійных спевакоў ці акцёраў, затое вельмі лёгка — экскурсаводаў, студэнтаў, юрыстаў, праграмістаў… Большасць калядуе ўжо не першы год, імкнучыся захаваць народныя традыцыі. Штогод вандраваць па краіне ў вольны час з уласнай ініцыятывы і за свой кошт іх прымушаюць зусім не калядныя дарункі (якіх, дарэчы, можа і ўвогуле не быць). Ніякі пачастунак не ідзе ў параўнанне з той асалодай, якую атрымліваеш, калі на тварах людзей запальваюцца радасныя ўсмешкі, а ў вачах зіхацяць водбліскі нібы ад калядной зоркі…

Вясёлая кампанія ў паўтара дзясятка людзей апранаецца хто Казой, хто Мядзведзем, хто Анёлам, хто проста надзявае яркія кашулі і хусткі. На мне — клятчастая спадніца, паверх курткі — камізэлька, падпярэзаная саматканым поясам, аўтэнтычны стагадовы фартух з геаметрычным арнаментам і чырвоная хустка на галаве. І вось я ўжо не карэспандэнт, а вясковая маладзіца пазамінулага стагоддзя. Уборы ў большасці складаюцца з таго, што змаглі знайсці або зрабіць сваімі рукамі. Можна быць жывёлай ці птушкай, зрабіць стылізацыю пад народны строй ці нават апрануць сапраўдны — абмежаванняў амаль няма. Галоўнае правіла «дрэс-коду» — не калядаваць «у джынсах», то бок, у паўсядзённым сучасным адзенні.

І цуд: калі апранаеш касцюм, калядны настрой з'яўляецца сам сабою. Са спевамі мы ідзем па цёмных гарадскіх вуліцах прыватнага сектара, несучы Віфлеемскую зорку наперадзе. Ніякага сцэнарыя няма, апроч «адпрацаванай» стагоддзямі традыцыйнай «схемы», у якой абавязкова прысутнічаюць пераходныя, вітальныя, адыходныя песні, спевы-прысвячэнні гаспадарам, дзецям, маладым хлопцам і дзяўчатам.

СТАР.3